**А. Васюкевіч**
*галоўны дырэктар Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё, дацэнт*

# БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ – 85 ГАДОЎ У ЭФІРЫ!

«Будзем разам!» – такі слоган самага вядомага, самага папулярнага і самага народнага радыё Беларусі, якое вось ужо 85 гадоў гучыць у эфіры, ствараючы радыёлетапіс краіны.

Гісторыя Беларускага радыё пачыналася ў сталічных клубах, чырвоных кутках і парках. Усталяванне «радыёкропкі» было значнай падзеяй і першым абанентам зайздросцілі многія, бо радыё адкрывала новы свет, давала новыя веды, знаёміла з цікавымі людзьмі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларускае радыё было асноўнай крыніцай інфармацыі для тых, каму выпала цяжкая доля змагацца з фашызмам у акупацыі. Пасляваеннае аднаўленне прынесла і бурлівае развіццё сетак радыёфікацыі. Радыё прыйшло літаральна ў кожную сям’ю.

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё – пераемнік традыцый той першай «радыёкропкі». Сёння – гэта сучасны, мабільны і высокапрафесійны радыёканал, які слухаюць мільёны радыёслухачоў ва ўсім свеце.

У структуры канала дзве дырэкцыі: дырэкцыя інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання і дырэкцыя музычнага і літаратурнамастацкага вяшчання.

Аператыўнасць, дакладнасць, актуальнасць, аб’ектыўнасць і кампетэнтнасць – галоўныя прынцыпы работы службы навін. Інфармацыйныя выпускі выходзяць кругласутачна ў пачатку кожнай гадзіны. Нашы карэспандэнты адсочваюць развіццё асноўных падзей у краіне і за мяжой.

Канал мае разгалінаваную і прафесійна падрыхтаваную карэспандэнцкую сетку. Гэта дазваляе аператыўна і ўсебакова асвятляць грамадска-палітычныя, эканамічныя і іншыя падзеі ў беларускіх рэгіёнах, у блізкім і далёкім замежжы. Нашы карэспандэнты працуюць у Арменіі, Малдове, Польшчы, Расіі, Украіне, краінах Балтыі. Іх аператыўныя рэпартажы з месцаў дазваляюць слухачам сачыць за развіццём падзей і быць іх віртуальнымі ўдзельнікамі.

Самая папулярная перадача канала «Радыёфакт» штодня па будзёных раніцах прапануе дзелавую размову аб палітыцы, эканоміцы, культуры, спорце. Мы расказваем пра ўсё, што нас акружае, турбуе, чым жывуць краіна і замежжа.

Інфармацыйную карціну дня дапаўняе ранішні інфармацыйны канал «Раніца з Беларускім радыё», у якім слухачам прапануюцца рубрыкі «Афіцыйная хроніка», «Навіны эканомікі», «Аўтанавіны», «Культура», «Спорт», «Надвор'е».

Інфармацыйным вечарам мы дзелімся меркаваннямі аб мінулым дні, падводзім яго вынікі. Кожны вечар госці праграмы «Пастфактум» – прадстаўнікі ўсіх галін улады, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, вядомыя палітыкі, эканамісты, грамадскія дзеячы – каменціруюць галоўныя падзеі дня.

Грамадска-палітычнае вяшчанне з'яўляецца адным з прыярытэтаў вяшчальнай палітыкі Першага нацыянальнага канала. Кампетэнтная размова ў прамым эфіры на вострыя тэмы ў штодзённай грамадска-палітычнай праграме «Актуальны мікрафон». У студыі сустракаюцца эксперты і журналісты для адказаў на пытанні радыёслухачоў.

Адзін з самых яркіх праектаў канала «Акцэнты» – дыскусія за круглым сталом палітолагаў, эканамістаў, сацыёлагаў, грамадскіх дзеячаў. «Пазіцыя» – грамадска-палітычная перадача з удзелам вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў, навукоўцаў па актуальных пытаннях дзяржаўнага будаўніцтва. Пра асноўныя напрамкі дзяржаўнай унутранай і знешняй палітыкі расказваецца ў праграме «Палітыка». Сучасныя тэндэнцыі ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў праграмы «Дыялог». Пра дзейнасць беларускага парламента, мясцовых саветаў дэпутатаў распавядае інфармацыйна-аналітычная праграма «Улада народа».

У публіцыстычнай праграме «Беларускі шлях» мы гаворым пра беларускую дзяржаўнасць. Палітолагі, сацыёлагі і простыя грамадзяне краіны абмяркоўваюць пытанні ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі, захавання нацыянальных традыцый, патрыятычнага выхавання маладога пакалення.

На канале выходзіць інтэрактыўны інтэрнэт-праект «Радыё.BY» – для тых, хто мае актыўную грамадзянскую пазіцыю і гатовы выказаць сваё меркаванне наконт таго, што адбываецца ў краіне і свеце.

Навіны аграпрамысловага комплексу, каментарыі спецыялістаў-

аграрыяў, нарысы аб вяскоўцах – у штодзённым праекце «Сельская раніца».

Сярод перадач сацыяльна-эканамічнай тэматыкі – аналітычны праект аб функцыянаванні айчыннага народна-гаспадарчага комплексу ў новых фінансава-эканамічных умовах «Эканоміка», «На парадку дня. Урадавы веснік» – перадача пра дзейнасць Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэалізацыю дзяржаўных праграм, распрацоўку нарматыўных дакументаў. З прадукцыяй беларускіх вытворцаў знаёміць перадача «Беларускае – лепшае». Пытанні развіцця малога і сярэдняга бізнесу, знаёмства з вопытам работы паспяховых прадпрымальнікаў – у праграме «Уласная справа». Аб развіцці беларускай навукі, дасягненнях і адкрыццях беларускіх вучоных распавядае тэматычны праект «Акадэмія навук». «Высокія тэхналогіі» – пазнавальная праграма аб развіцці ІТ-тэхналогій у Беларусі і свеце. Праграма па зваротах слухачоў з крытычнымі заўвагамі, прапановамі і пажаданнямі – «Грамадская прыёмная».

Мае сваю шматлікую аўдыторыю і дыскусійная перадача «За і супраць». Гэта абмен меркаваннямі па розных пытаннях палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага, культурнага жыцця. У студыі праграмы сустракаюцца людзі, чые пазіцыі дыяметральна разыходзяцца.

Віртуальнае падарожжа па беларускіх гарадах і мястэчках прапаноўвае праграма «Мая краіна – Беларусь». З гісторыяй і культурай краін свету знаёміць «Радыёваяж». Культура і традыцыі народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у Беларусі, дзейнасць дыяспар – тэмы перадачы «Супольнасць».

Вялікую папулярнасць маюць сямейная праграма «Для тых, хто дома», перадача для дзяцей і моладзі «Адкрытая пляцоўка», інтэрактыўная музычна-забаўляльная праграма для і пра людзей начных прафесій «Пасля поўначы» і іншыя.

Літаратурна-мастацкае вяшчанне на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё – гэта цэлая палітра аўдыёзнаёмстваў слухачоў з багатай культурнай і літаратурнай спадчынай, якая дае магчымасць быць дасведчаным у тэндэнцыях развіцця мастацкага слова. У літаратурна-мастацкіх праграмах актыўна выкарыстоўваюцца ў якасці выразнага сродку пастановачныя элементы.

Літаратурна-мастацкія праграмы сёння гэта: цыклавыя праекты дакументальна-публіцыстычнага характару, у якіх гаворка ідзе аб бела-

рускай класічнай і сучаснай літаратуры, рэпартажы з выстаў, юбілейных і творчых вечароў, прэзентацый кніг, агляды літаратурных часопісаў, размовы ў студыі з пісьменнікамі, літаратуразнаўцамі, крытыкамі, тэматычныя «круглыя сталы», пастановачныя праекты, ў якіх выкарыстоўваюцца мастацкія фонды Беларускага радыё.

На канале транслюецца шмат радыёспектакляў, радыёпастановак, інсцэніровак казак і апавяданняў. Рэгулярна ладзяцца прэм'еры. Штодзённа ў эфіры гучаць радыёсерыялы «Кароткія гісторыі» для дарослых і «Вячэрняя казка» для самых маленькіх, запісы трансляцый лепшых спектакляў вядучых драматычных тэатраў краіны.

Музычнае вяшчанне канала арыентавана на радыёслухачоў усіх узроставых катэгорый і сацыяльных груп. Прыярытэтам музычнай палітыкі з'яўляецца прапаганда творчасці беларускіх аўтараў і выканаўцаў.

У аснове музычнай канцэпцыі – беларуская музыка як частка сусветнай культуры. Галоўныя функцыі музычнага вяшчання: асвета, фарміраванне мастацкага густу, знаёмства з лепшымі ўзорамі музычнай класікі і дасягненнямі сучасных кампазітараў і выканаўцаў, стварэнне добрага настрою. Важны элемент музычнага вяшчання – тэматычныя перадачы аб падзеях, з'явах, стылях, жанрах беларускай музыкі ў кантэксце сусветных музычных тэндэнцый. На канале гучыць папулярная, класічная, тэатральная, дзіцячая, аўтарская, электронная, джазавая, народная музыка.

Адным з яркіх праектаў, прысвечаных 85-годдзю Беларускага радыё, стаў творчы конкурс маладых музыкантаў «Маладыя таленты Беларусі». Ён накіраваны на выяўленне і падтрымку маладых таленавітых выканаўцаў у розных жанрах музычнага мастацтва, асвятленне дзейнасці маладых музыкантаў, іх творчых поспехаў і дасягненняў, павышэнне творчага майстэрства і выканальніцкай культуры юных талентаў, папулярызацыю творчасці беларускіх музыкантаў.

Арганізацыя спецыяльных праектаў – добрая традыцыя Беларускага радыё. Да 65-годдзя Вялікай Перамогі на Першым нацыянальным канале выходзіць дакументальна-публіцыстычны праект «Эпізоды Вялікай вайны». Перадача рыхтуецца сумесна з Беларускім грамадскім аб'яднаннем ветэранаў. У праекце гучаць радыёнарысы аб героях-вызваліцелях, успаміны ветэранаў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Шырока выкарыстоўваюцца фондавыя запісы і архіўныя дакументы. У

рамках праграмы выходзіць рубрыка па музычных заяўках ветэранаў «На добры ўспамін».

Радыёсустрэчы франтавікоў, сваякоў і старых сяброў праз дзесяцігоддзі арганізуюцца ў публіцыстычнай праграме «Помні імя сваё ...». На прыкладзе біяграфій яе ўдзельнікаў, мы даследуем лёсы, па матэрыялах пошукавых груп праводзім журналісцкія расследаванні. Асноўная частка праграмы прысвечана пошуку невядомых салдат, герояў Перамогі, франтавых сяброў, устанаўленню месцаў пахавання загінуўшых у гады вайны.

У праекце «Тэатр Беларускага радыё» транслююцца радыёспектаклі на ваенную тэматыку: «Васіль Корж» (па п’есе С. Грахоўскага), «Мёртвым не баліць» (па аповесці В. Быкава), «Вазьму твой боль» (па рамане І. Шамякіна), «Чарняхоўскі» (па рамане І. Мележа «Мінскі напрамак»), «Хатынская аповесць» (па аповесці А. Адамовіча), «Пастка» (па аповесці В. Быкава) і іншыя.

У эфір выйшаў тэматычны цыкл радыёкампазіцый «У вузел звязваю тугу...» па ваенных вершах беларускіх паэтаў А. Куляшова, П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі, А. Бысіна, М. Лужаніна, Я. Купалы, Я. Коласа, П. Глебкі. Інсцэніраваны апавяданні на ваенную тэматыку беларускіх пісьменнікаў Л. Арабей, А. Дударава, К. Чорнага, Ф. Янкоўскага.

За захаванне і памнажэнне нацыянальнай спадчыны творчы калектыў Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё быў удастоены залатога медаля ў намінацыі «Брэнд-Спадчына» па выніках прафесійнага конкурсу «Брэнд года-2008».

Міжнароднае журы, у склад якога ўвайшлі вядомыя спецыялісты і эксперты ў галіне маркетынгу, брэнд-менеджменту, рэкламы і камунікацый з Беларусі, Украіны і Расіі, высока ацанілі дзейнасць канала па пашырэнні інтарэсаў краіны ў міжнароднай медыяпрасторы, фарміраванні пачуцця патрыятызму і любові да роднай зямлі, выхаванні маладога пакалення на лепшых ўзорах беларускай культуры. Журы асобна адзначыла работу канала па прапагандзе беларускага мастацтва і мовы, а таксама ўклад ва ўмацаванне міждзяржаўных і сяброўскіх адносін. Падчас конкурснага абмеркавання неаднаразова падкрэслівалася асаблівая роля канала ў інфармаванні слухачоў пра падзеі ў палітычным, эканамічным і сацыяльным жыцці краіны і сусветнага супольніцтва.

Рэалізацыя маркетынгавай стратэгіі развіцця і пашырэння прысутнасці канала на медыярынку таксама была адзначана бронзавым меда-

лём ў прафесійнай намінацыі «Сродкі масавай інфармацыі». Галоўны інфармацыйны і грамадска-палітычны радыёканал Беларусі пастаянна ўдасканальваецца: штогод праводзяцца творчыя конкурсы праектаў, карэкціруецца сетка вяшчання і абнаўляецца музычнае афармленне.

Фармаціраванне вяшчання дазволіла істотна пашырыць слухацкую аўдыторыю і замацавацца на першых рэйтынгавых пазіцыях.

Па даных сацыялагічных даследаванняў, праведзеных Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доля аўдыторыі канала ў рэспубліцы складае 31,5 %, што больш як у тры разы перавышае паказчыкі радыёстанцый, якія ўваходзяць у тройку лідэраў. Штодзень перадачы Першага нацыянальнага слухаюць больш за 1 мільён жыхароў Беларусі. Дзякуючы онлайн-вяшчанню ў інтэрнэце канал ведаюць у многіх краінах далёкага і блізкага замежжа.

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё актыўна развівае стасункі з замежнымі партнёрамі. Рэгулярна праводзяцца міждзяржаўныя радыёмасты, пашыраецца супрацоўніцтва з радыёкампаніямі Азербайджана, Літвы, Латвіі, Малдовы, Расіі, Украіны, краін-членаў Еўрапейскага і Азіяцкага вяшчальных саюзаў.

На працягу апошніх пяці гадоў рэалізуецца дагавор з тэлерадыёвяшчальнай арганізацыяй Саюзнай дзяржавы аб сумеснай вытворчасці інфармацыйна-аналітычнай радыёперадачы «Беларусь – Расія».

Традыцыйным стала штогадовае правядзенне Дзён Беларускага радыё на Радыё Малдовы, якія маюць станоўчы водгук у малдаўскіх радыёслухачоў.

У рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве ў сферы радыё і тэлебачання, падпісанага Белтэлерадыёкампаніяй і Кубінскім інстытутам радыё і тэлебачання на канале быў праведзены тэматычны радыёдзень, прысвечаны развіццю стасункаў Беларусі і Кубы.

Прадстаўнікі канала пастаянна прымаюць удзел у мерапрыемствах, якія праводзіць Еўрапейскі вяшчальны саюз па тэматыцы радыёвяшчання. Сумесна з радыёстанцыяй «Беларусь» Першы нацыянальны канал рыхтуе і размяшчае інфармацыйныя праграмы аб жыцці Беларусі на серверы файлаабменнай сістэмы ЕВС «Euroradio News», удзельнікамі якой з’яўляюцца больш за 110 вяшчальных арганізацый.

Амаль 10 год на канале рэалізуецца сумесны з Радыё ААН праект «Навіны планеты», у якім знаходзяць адлюстраванне падзеі глабальнага маштабу, абмяркоўваюцца праблемы, што хвалююць людзей па

ўсім свеце: забеспячэнне міжнароднай бяспекі, умацаванне сістэмы міжнароднага права, процідзеянне гандлю людзьмі і распаўсюджванню інфекцыйных захворванняў, экалагічныя праблемы і іншыя. Асаблівая ўвага надаецца ініцыятывам Беларусі ў дзейнасці ААН.

Сярод перспектыўных планаў развіцця Першага нацыянальнага – далейшае павелічэнне долі рынку, павышэнне якасці праграмнага прадукту ў кантэксце агульных тэндэнцый развіцця радыёвяшчання і інтэграцыя ў міжнародную медыяпрастору.